**А. І. БЕЛЬСКІ,**
доктар філалагічных навук,
прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

# СВЕТ ДЗЯЦІНСТВА Ў ПРОЗЕ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА

**Сёлета, у лістападзе, мінае 70 гадоў з дня смерці Кузьмы Чорнага, класіка беларускай літаратуры, а на 2015-ы прыпадае яго 115-гадовы юбілей. Чакаюць нас і іншыя юбілейныя даты пісьменнікаў, адзначаныя ў «Інструктыўна-метадычным пісьме Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь» (гл. № 8 нашага часопіса, с. 15).**

**Прапанаваны вашай увазе матэрыял можна выкарыстаць на ўроках у VI і X класах. Асобныя яго фрагменты прыдадуцца пры падрыхтоўцы вучнямі паведамленняў ці міні-рэфератаў, распрацоўцы тэм даследчых работ.**

«Чалавек — гэта цэлы свет», — следам за Ф. Дастаеўскім паўтарыў гэтую біблейскую думку Кузьма Чорны. Яна была беларускаму пісьменніку ўнутрана блізкай і па сутнасці стала галоўнай формулай літаратурнай творчасці. Кузьма Чорны засяроджана разглядаў кожнага свайго значнага героя, ён стварыў вельмі шмат адметных літаратурных тыпаў і характараў. Сярод іх нямала вобразаў дзяцей і падлеткаў. Дзяцінства пісьменнік бачыў як асобны цэлы свет, які ён імкнуўся адлюстраваць па-мастацку адметна і спасцігнуць у глыбінных праявах. Феномен дзяцінства прыцягваў Кузьму Чорнага на працягу ўсёй творчасці, пачынаючы ад ранняга перыяду і да апошніх філасофскіх раманаў, дзе ён выйшаў на асэнсаванне надзвычай важных быційных пытанняў і агульначалавечых праблем.

Кожны пісьменнік, як вядома, пачынаецца з дзяцінства. Менавіта ў гэтай узроставай пары трэба шукаць вытокі яго таленту, пачатак яго будучых твораў, прататыпы герояў. У гэтым пераконваюць жыццё і кнігі Ч. Дзікенса, М. Твэна, Ф. Купера, Л. Талстога, І. Тургенева, А. Купрына, І. Буніна, Т. Мана, А. дэ Сэнт-Экзюпеacyперы і іншых сусветна вядомых пісьменнікаў. Дзяцінства наклала свой глыбокі адбітак і на нашых класікаў: Максіма Багдановіча, Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Змітрака Бядулю...

Кузьма Чорны (1900—1944) досыць часта вяртаўся ў думках да свайго ранняга этапу жыцця, згадваў малую радзіму. Нарадзіўся будучы пісьменнік на Случчыне ў маёнтку Боркі ў сям'і панскага парабка. Гадаваўся ў фальварках Лапацічы і Вінцэтова. А калі хлопчыку споўнілася восем гадоў, бацькі прыехалі ў мястэчка Цімкавічы, адкуль яны былі родам. Тут і прайшлі ўсе наступныя дзіцячыя гады будучага класіка беларускай прозы. У нарысе «Сэрца, у якім месціўся цэлы свет» (1964) С. Александровіч, выкарыстоўваючы найперш цікавыя факты з успамінаў сясцёр Кузьмы Чорнага, распавёў пра цімкавіцкі перыяд жыцця пісьменніка. Вось толькі некалькі фрагментаў, якія датычаць яго дзяцінства: «Найбольш хлопчык любіў свайго дзеда Міхала. Міхал Парыбак дняваў і начаваў у зяцевай хаце, няньчыў унукаў і ўнучак... Узяўшы ўнукаў — каго на рукі, каго за руку, ён ішоў у Бушылава ці Скіп'ёўскі лес, садзіўся на траву дзе-небудзь у зацішку, расказваў, як растуць дрэвы...»; «Найбольш сябраваў у дзяцінстве Мікола з Сэлінымі дзяўчатамі — Надзяй, Лізай, Марыляй і асабліва Сашай. Сэляй у Цімкавічах называлі Саламею Доменя [Даменю. — *А. Б.*], муж якой працаваў механікам на млыне... Да Сэліных дзяўчат хадзілі гуляць Колевы сёстры — Маня і Ганна, а пасля і ён»; «Коля многа і добра маляваў, вельмі любіў і разумеў музыку. Недзе дастаў балалайку і навучыўся сам на ёй іграць» [1, с. 235—236]. Дзяцінства пакінула ў памяці і свядомасці пісьменніка глыбокі след, яно з вышыні пражытага выклікала ў яго дваякія пачуцці. У «Аўтабіяграфіі» Кузьма Чорны пісаў: «Я ўспамінаю жыццё сваіх бацькоў і сваё маленства. Гэта быў жудасны час, калі кавалак хлеба і палатняная рубашка — адна на год,

клопаты леглі на яе плечы. Чырвонаармеец, герой твора, становіцца сведкам вельмі кранальнай, шчымлівай сцэны ў вясковай хаце: на досвітку маці будзіць хлопчыка, якому вельмі хочацца спаць. Падымае яго так рана, бо трэба пасвіць карову і няма больш на каго спадзявацца, як на малога сына — адзінага памочніка:

— Уставай, сынок, — гаворыць жанчына.

Усё маўчыць.

— Сынок, устань.

— Ай, мама…

— Устань, сынок, ну хто ж устане, ты ж самы большанькі.

— Я яшчэ хоць трохі пасплю…

— Заснеш удзень, а цяпер — ну каго ж я пабуджу.

Хлапчанё заплакала. Ён доўга зацягнуў санлівым голасам, цягнуў і, мусіць, спаў. Пасля раптам сціх. Жанчына маўчала.

Высвятляецца, што ў хлопчыка нарывае параненая аб корч нага. Словам, няшчаснае дзіця. Сэрца жывога чалавека не можа не сціснуцца ад болю і шкадавання. Невыпадкова чырвонаармеец адчувае «сябе так, як бы ў чым вінаваты тут». Ён імкнецца хоць на хвіліну затрымацца ў хаце і пагаварыць з гаротнай жанчынай, выслухаць яе споведзь-скаргу. Магчыма, ёй будзе хоць крышачку лягчэй. У апавяданні Кузьмы Чорнага «Начлег у вёсцы Сінегах» упершыню ў творчасці пісьменніка гучыць тэма адабранага дзяцінства, выяўлена пачуццё глыбокай спагады і спачування дзецям ва ўмовах ваеннага ліха.

Пісьменнік у шэрагу твораў уражальна паказаў, як сацыяльныя абставіны змушаюць дзяцей пакутаваць, выжываць у нястачы і беднасці. Кузьма Чорны быў з народных нізоў, належаў да сямей маламаёмасных цімкавіцкіх местачкоўцаў. Ён добра ведаў долю панскіх парабкаў, бясхатнікаў і беззямельнікаў, з дзяцінства быў далучаны да сялянскай працы, сам спазнаў, як цяжка даецца яго бацькам і землякам кавалак хлеба. Яму было шкада абяздоленых дзяцей, іх бацькоў, хацелася, каб больш міласэрным і гуманным было жыццё, мяняліся адносіны між людзьмі і каб яны шанавалі і шкадавалі дзяцінства. Тэма сіроцтва ўздымаецца пісьменнікам у апавяданні **«Браты»** (1931). На пачатку твора ён стварае яскравы і запамінальны партрэт хлопчыка Гурыка, які, скурчыўшыся, спіць на халоднай восеньскай траве тварам уніз. Ніхто ў горадзе, дзе віруе рабочы люд, не зважае на гэтага «абшарпанага хлапчука», нікому няма да яго ніякай справы і клопату. Здаецца, навідавоку абыякавасць да дзіцячага лёсу. Ужо адзін гаротны выгляд Гурыка — дакор дарослым і грамадству. Апавядальнік быццам бы староннім вокам далей назірае за ім, няшчасным дзіцем: «Хлапчук, перад тым як сысці з веранды, колькі разоў прагна агледзеў столікі. Толькі на адным століку ён заўважыў недаедзены і непрыбраны кавалак хлеба. Ужо сыходзячы ў сад, ён даядаў яго». Далей мы даведваемся пра сіроцтва падлетка, пра яго лёс дзетдомаўца і бадзягі: «А ён… там жа ў дзіцячым доме астаўся. Але… не пабыў доўга на адным месцы. Збег некуды. А пасля зноў з’яўляўся, пасля зноў прападаў немаведама куды…». Шчасце Гурыка, што на яго шляху сустрэлася чулая і спагадная старэйшая дзяўчына Хана, якая ставіцца да яго як да малодшага брата і апякуецца ім. Яна кажа: «Дык я ўжо цяпер яго ад сябе не пусціла. Мы сюды прыехалі. Я ўжо залічана на работу, на новую галантарэйную фабрыку…» Гурык таксама знайшоў працу, ён спатрэбіўся ў якасці «рабочай сілы» на заводзе. Здавалася б, яму варта яшчэ падрасці, набрацца жыццёвай моцы і трэба вучыцца ў школе. Аўтар твора ў абліччы і характары падлетка падкрэслівае такую рысу, як дачаснае сталенне: «Гэта была… упартая сталасць бывалага чалавека. Дзе ён не быў і чаго ён не бачыў?»; «І праўда, ён вырас. Але тут ніхто не ведаў яго, каб параўнаць цяперашняга яго з тым, якім ён быў хоць бы і летась яшчэ». Пісьменнік паказаў станаўленне працоўнага чалавека ва ўмовах бурнага развіцця індустрыяльнага грамадства. Учарашні лёс сіраты і беспрытульніка мяняла праца, ён атрымоўваў магчымасць з яе жыць. Кузьма Чорны меў спадзяванне, што савецкая ўлада зможа ліквідаваць беспрацоўе, station ўлада зможа ліквідаваць беспрацоўе, станоўча вырашыць праблему сіроцтва. Ён лічыў, што праца, занятак павінны быць у кожнага чалавека, пра яго трэба дбаць і клапаціцца, дапамагчы ўладкавацца ў жыцці, даць надзею. Пазней, у ваенным рамане «Млечны Шлях», Кузьма Чорны напіша: «Няхай жыве ўсясветная дбайнасць аб кожным чалавеку, які толькі хоць дзе на зямлі радзіўся на свет». Пісьменнік верыў, што кожнае бяздомнае, беспрытульнае дзіця дзякуючы чалавечай спагадзе і падтрымцы мае шанец на ўратаванне, іншы лёс. Нельга быць безуважным і абыякавым, пакідаць дзіця сам-насам у яго бядзе і нядолі, трэба дапамагчы яму знайсці сябе сярод людзей, адкрыць шлях да сваёй будучыні.

Трагічны лёс дзяўчынкі надзвычай глыбока перададзены пісьменнікам у апавяданні **«Дарагуся»** (1939). Гэты твор пераконвае, што Кузьма Чорны вельмі тонка адчуваў дзіцячую псіхалогію і душу, асабліва праніклёна раскрываў свет дзіцячых эмоцый і перажыванняў. Пісьменнік акунае чытача ў атмасферу заходнебеларускай сям’і, у якой цяжка хварэе адзіная дачушка. Вось што кажа яе бацька Сцяпан: «У мяне дзяўчынка памірае ад сухот і не можа есці без солі. Яна з вечнага голаду ў сухотах». Местачковы фельчар раіць дзяўчынцы добра харчавацца. Аднак сям’я існуе ў беднасці, нястачы,

у хаце не стае нават солі, таму ў бацькоў няма магчымасці ўратаваць сваё няшчаснае дзіця. Адзінаццацігадовая Люся згасае на вачах, сыходзяць апошнія гадзіны і хвіліны яе жыцця. Аўтар шчымліва-кранальна апавядае пра вялікае сямейнае гора, якое балюча раніць і прыгнечвае бацькоў. Асабліва эмацыянальна праніклiва празаік перадае хваляванні і неспакой матчынага сэрца. Звяртаючыся да дачушкі, у свае словы Кацярына ўкладвае ўсю бязмежную мацярынскую любоў, пяшчоту і шкадаванне: «— Дачушка, Люся-Дарагуся, можа табе лепш сёння?» Маці-гаротніца да самага апошняга верыць у лепшае, спадзяецца на вышэйшую міласэрнасць, чакае цуду-збавення дачкі: «— Дарагуся заснула... На змярканні ёй было так дрэнна, яна так аслабела. А гэта заснула, мо ў сне яна памацнее. Ах, каб пайшло на папраўку». Дачка для Кацярыны і яе мужа — адзіны, самы дарагі і каштоўны на свеце скарб, па сутнасці яны нічога больш значнага, як дзіця, не маюць. Яе будучыня стала сэнсам іхняга жыцця. Пісьменнік для выяўлення трагізму сітуацыі па-майстэрску скарыстоўвае мастацка-псіхалагічную дэталь — вобраз двух жоўтых лісткоў на старой грушы, якія сузірае праз акно хворая дзяўчынка. Адзін лісток адарваўся, пакружляў у паветры і прыліп да шыбы. Па просьбе Люсі бацька прыносіць ёй гэты лісток. Бацька падараваў свайму дзіцяці ўсмешку, хвілінку радасці. На дрэве жыцця гэтак, як апошні жоўты лісток, ледзь-ледзь трымаецца лёс Люсі-Дарагусі. Смерць няўмольная, яна бязлітасна ўкрыжоўвае бацькоў-пакутнікаў. З прыкметнай псіхалагічнай і сацыяльнай заглыбленасцю пісьменнік паказвае жыццёвую драму людзей у Заходняй Беларусі, гаспадара сям'і, тыпізуе абставіны, падкрэсліваючы: «У гэтай дробнай дванаццаціхатняй вёсачцы ўсе жылі так, як ён». Як можна пераканацца на прыкладзе гэтага апавядання, жыццё і пакуты дзіцяці для пісьменніка — самая высокая сацыяльна-этычная і гуманістычная мерка.

У цэнтры апавядання **«Зямля»** (1940) — лёс сям'і аратага, які працуе на пана Лечашынскага. Паднявольны працаўнік «ужо гадоў пятнаццаць арэ... гэтую зямлю», не прычакаў жаданага дастатку і дабрабыту. У яго няма іншага сэнсу ў жыцці, як клопат пра дзяцей. Зосю, жонку панскага парабка, таксама «мучылі... цяжкія думкі аб дзецях». Працуе чалавек і «баіцца, каб не прагналі з работы, каб як-небудзь пражыць на свеце, каб як-небудзь выкіравацца так, каб былі накормлены дзеці, каб усе былі здаровымі...». Менавіта так жылі і гаравалі бацькі Кузьмы Чорнага — Каролек і Гліцэра Раманоўскія, якія падаліся ў Боркі і Лапацічы на парабчанскую працу. Бацька пісьменніка залежаў ад пана, шчыраваў з іншымі беззямельнікамі на чужой гаспадарцы. Вуснамі Зосі, гераіні апавядання «Зямля», аўтар выказвае па сутнасці трывогу сэрца сваёй маці, якая хвалявалася пра лепшую долю ўласных дзяцей: «Ну, што ж, вырастуць дзеці, дык думка не дае жыць, — на якое шчасце яны растуць і як яны жыць будуць». Бог дае дзяцей і, як даводзіць селянін-араты ў творы, «Бог стварыў... зямлю для ўсіх роўна...». Пісьменнік, спачуваючы долі свайго героя, усклікае: «Як цесна жыць у шырокім свеце!» Гэтак, як і Міхал з «Новай зямлі», чорнаўскі герой і яго жонка мараць мець уласны кавалак зямлі, выкупіць яго ў пана. Памятаеце, як думка пра зямлю моцна завалодала коласаўскім Міхалам? Якуб Колас дакладна выказаў спрадвечнае жаданне беларускага сялянства: «Купіць зямлю... Свая зямля — вось што аснова!» Зямля — крыніца дабрабыту сям'і, запарука таго, што дзеці будуць жыць інакш, будуць больш шчаслівыя, чым іх бацькі. Зося адважылася і сказала жонцы пана пра выкуп зямлі. Паднявольныя і залежныя людзі, яны з мужам хочуць пачуваць сябе гаспадарамі. Яны ведаюць, што з працы не на чужой, а на сваёй зямлі можна больш-менш забяспечыць будучыню дзяцей. У апавяданні пісьменнік вельмі пачуццёва, з душэўнай праніклівасцю перадае дзіцяча-бацькоўскія адносіны. Вось сцэна сустрэчы малой Ганкі з бацькам:

> Калі, бывала, спаткае яна на дарозе бацьку і кінецца да яго, той раней падніме яе высока на руках, некалькі разоў пацалуе, паставіць на зямлю, заўсёды патрэпле і паблытае на яе галаве густыя, жаўтаватыя ад сонца валасы і скажа:
> — Ну, хадзем, дачушка! Мама здарова?

У натуры свайго героя аўтар падкрэслівае вызначальную рысу — «быў няспынна прывязан да сваёй сям'і», «дзяцей сваіх яму прыходзілася заўсёды шкадаваць». Любоў, дабрыня і шкадаванне — гэтыя хрысціянскія пачуцці ўвасабляюць сутнасць бацькоўства. У чорнаўскім успрыманні маці — жанчына-ахвярніца, яе вобраз створаны з падкрэсленым захапленнем і нават абагаўленнем — перад намі мадонна, для якой дзіця складае галоўны сэнс жыцця. Пісьменнік выяўляе сваё адчуванне значнасці і вялікасці вобраза маці: «Якое яму было шчасце чуць у сваёй хаце галасы дзяцей і жонкі! Яна была малая ростам і шчуплая жанчына, часта здавалася яму малой дзяўчынкай. Але калі яны пачыналі гаварыць аб дзецях, якой моцнай і велічнай яна здавалася яму. Яна гадавала трое дзяцей, і як гадавала!». У канцы апавядання Кузьмы Чорнага, як і ў шэрагу іншых твораў, знайшла адлюстраванне сацыяльна-класавая барацьба і змаганне з панамі, якія не дбалі пра сваіх парабкаў і беззямельных сялян. Словы пісьменніка пра «ненавідны позірк» і паляванне на былых гаспадароў

жыцця — таксама гістарычная праўда часу. Аднак не гэта сутнаснае і галоўнае ў чорнаўскім творы. Апавяданне «Зямля» — гэта сямейная міні-сага, ціхае і сардэчнае прызнанне ў любові да сваіх бацькоў, якія жылі і пакутавалі дзеля лепшай будучыні дзяцей.

У творы **«Сцяпанавы дзеці»** (1939) супрацьпастаўляюцца цяжкае, гаротнае жыццё дзяцей у часы паншчыны і шчаслівае дзяцінства пры савецкай уладзе. Розняцца лёсы бацькі-парабка і яго сына Сцяпана. Сацыяльны кантраст тут навідавоку. Бацька з малым сынам-напаўсіратой так і не займеў свайго прытулку — «хату... хоць старэнькую, хоць малую, хоць трухлявую і гнілую». Урэшце, ён захварэў і ад цяжкай працы на пана Бірулю памёр. Яго сын Сцяпан, нягледзячы на тое, што застаўся круглым сіратой, прычакаў іншай долі. Ён, былы панскі пастушок, працуе ў калгасе, мае «новы дом на восем акон». Яго трое дзетак «елі смачную вячэру», яны могуць спакойна выспацца ва ўласнай хаце, спачываюць у чыстых пасцелях, маюць магчымасць надзець новую вопратку, хадзіць у школу і вучыцца. Большыя Толя і Насцечка мараць пра тое, кім будуць, калі стануць дарослымі, — перад імі адкрываюцца жыццёвыя далягляды. Сапраўды, у Сцяпанавых дзяцей зусім іншае маленства. У партрэце Толі, Сцяпанавага сына, пісьменнік падкрэслівае вонкавае падабенства з бацькам. І гэта невыпадкова. Яны падобныя нібы дзве кроплі вады, але як кардынальна адрозніваюцца іх дзіцячыя лёсы: «Быццам той самы Сцяпанка цяпер стаяў перада мной. Толькі што Толя быў у чыстай рубашцы і новых сініх штоніках. Ногі яго не былі ў струпах і нарывах, твар яго быў свежы і вясёлы, а не цьмяны і змучаны ад бессані». Герой твора, а разам з ім пісьменнік, вяртаецца ў родныя мясціны і быццам здзяйсняе вандроўку ў сваё дзяцінства, мінулае, якое ўспрымаецца як «сапраўдная далёкая казка». Памяць аднаўляе дзіцячыя гады, калі нароўні з дарослымі патрэбна было рана прачынацца і гнаць жывёлу на выпас, выконваць свае працоўныя абавязкі. Апавядальнік, згадваючы дзяцінства сваё і сябра Сцяпана, адзначае падабенства хлопчыкаў, якіх з'яднаў агульны пастушкоўскі лёс: «Абодва мы былі падобны адзін да аднаго. Мы былі босыя. Ганяючыся ў полі за жывёлай, мы натыкаліся на карчы і каменне; пальцы на нагах у нас былі пазбіваныя, у струпах. Але самае страшнае — гэта было ўставаць да ўсходу сонца і гнаць на пашу жывёлу. Кожны з нас аддаў бы ўсё самае найлепшае і жаданае за тое, каб хоць паўгадзіны яшчэ паспаць. Так хацелася спаць у гэтыя першыя мінуты надыходзячай раніцы!». Кузьма Чорны малюе тыповы лёс сялянскіх дзяцей, ён апавядае і пра сваё ўласнае пастушкоўскае маленства, пазбаўленае многага з таго, што маюць з малых гадоў героі ягонага твора. Апавядальніка цешыць і радуе, што Сцяпанавым дзецям ёсць дзе жыць, ёсць што есці, што ў іх ёсць будучыня.

Звернем увагу: твор Кузьмы Чорнага быў напісаны ў канцы 1930-х гг., а надрукаваў яго, дарэчы, часопіс «Іскры Ільіча» (1939, № 8). Пісьменнік на той момант добра ведаў, што рознае дзяцінства і ў савецкіх ды беларускіх дзяцей. У «Дзённіку» ён з болем усклікаў: «Колькі нашай інтэлігенцыі без дай прычыны гніе ў турмах і на высылцы! У мяне ўжо няма 70 % здароўя...» [2, с. 592] (апошні запіс ад 22 лістапада 1944 г.). Малая дачка пісьменніка Рагнеда-Ірына пэўны час не бачыла бацьку дома. У кастрычніку 1938 года Кузьму Чорнага арыштавалі, ён прайшоў праз сталінскую няволю і катаванні. Рагнеда магла б надоўга стаць дачкой «ворага народа», калі б у чэрвені 1939 года бацьку не выпусцілі з турмы. Вось у такіх абставінах з'явілася ў друку чорнаўскае апавяданне «Сцяпанавы дзеці». Пісьменнік, які ўслаўляў шчаслівае савецкае дзяцінства, стаў ахвярай сталінскага рэжыму.

Творчай удачай Кузьмы Чорнага з'яўляецца аповесць для дзяцей **«Насцечка»** (1940), якая і па сённяшні дзень лічыцца адным з лепшых твораў пра ўзаемаадносіны падлеткаў. Аўтар грунтоўна малюе два тыпы дзіцячых характараў і сутыкае іх у адкрытым канфлікце. Насця Закрэўская — станоўчы вобраз дзяўчынкі, якая ўвасабляе лепшыя дзіцячыя рысы і можа быць прыкладам для пераймання. Яна выхаваная, добра вучыцца, умее сябраваць, чулая і спагадная, да таго ж смелая і рашучая, можа пастаяць за сябе, абараніць уласную годнасць. Аўтар аповесці адзначае, што Насця «была бойкая і рухавая дзяўчынка, белатварая, з густымі валасамі, якія роўна ляжалі на яе галаве пад грабянцом». Яна клапоціцца пра хворага дзядулю, вельмі сумуе па сваёй маме, якая вучыцца ў Маскве. Серж Мілеўскі — яе антыпод: нявыхаваны, зласлівы і капрызны, нахабны і помслівы, нават вельмі жорсткі, да таго ж ганарысты, пыхлівы, самаўлюбёны. Ён пагарджае іншымі, крыўдзіць дзяўчынак, здзекуецца з Насцечкі, з упартасцю і самаўпэўненасцю пярэчыць настаўніцы, абражае старога чалавека, паводзіць сябе бесцырымонна і груба. Па сутнасці перад намі малы распешчаны хам і хуліган. Гэты фанабэрлівы эгаіст і задзірысты свавольнік ужо пачувае сябе ледзь не звышчалавекам, прэтэндуе на абранасць і выключнасць. Серж прызвычаіўся глядзець на аднакласнікаў і дарослых звысоку, па-сапраўднаму ні з кім не сябруе, патрабуе ад бацькоў грошы і машыну, каб ехаць у школу, ігнаруе элементарныя правілы прыстойнасці і культуры паводзін. Пісьменнік заўважае, што «ў вачах яго свяцілася

гэтулькі самазадавальнення, гэтулькі ўцехі з самога сябе, што здавалася, — гэты маладзенькі францік зараз заплюе вочы ўсяму свету і скажа: — Эй вы, бачыце, які я спрытны і харошы. А вы ўсе перада мной нейкія пачвары, і больш нічога». Далей аўтар гаворыць пра Сержа наступнае: «І пакрысе ў ім укаранілася ўпэўненасць, што ён нейкая выдатная асоба, а ўсе перад ім нічога не варты. І калі часамі ў яго была якаянебудзь няўдача, ён злаваў і стараўся спагнаць злосць на кім-небудзь, замест таго каб самому, сваімі сіламі, паправіць справу». Пры ўсёй сваёй упэўненасці і нахабстве на самай справе Серж меў палахлівы характар. Ён жахнуўся, калі яго схапіла «моцная рука» старога Закрэўскага, ён выглядае баязлівым і дужа непакоіцца, калі яму трэба адказваць за ўчыненае. Высвятляецца, што «ўвесь свет вінаваты перад гэтым Сержам, і толькі ён адзін нявінны і цярплівы». Хлопчык плача, ён не хоча і не ўмее прызнаць сваю віну, папрасіць прабачэння ці даравання, выдае сябе за ахвяру і пакутніка.

Пісьменнік, паказваючы паводзіны дзяцей, імкнуўся адшукаць і зразумець прычыны таго ці іншага ўчынку, вытокі як добрага, так і негатыўнага ў дзіцячым характары і дзіцячай душы. Кузьма Чорны справядліва звязваў праблему станаўлення асобы чалавека з сямейным асяродкам і школай, дзе закладваюцца асновы паводзінаў дзіцяці, культуры чалавечага існавання, найперш разумення добрага і дрэннага, прыгожага і агіднага. Тое, што Серж Мілеўскі стаў па сваёй натуры эгаістам і пачуваецца гаспадаром становішча, вінаваты найперш бацька хлопчыка, які не хоча бачыць і разумець, кім робіцца яго сын. З твора мы даведваемся, што той практычна ўхіліўся ад выхавання Сержа: «Бацька яго быў даволі буйны работнік у горадзе, і многа людзей ведала яго. Ён быў заўсёды вельмі заняты працай… Нават і ў выхадныя дні ён часта бываў заняты. А калі выдаралася яму вольная часіна, ён садзіўся ў машыну, браў з сабой свайго адзінага сына Сержа і выязджаў за горад адпачыць на прыродзе. Больш ён свайго Сержа бадай што і не бачыў». Пісьменнік завастрае праблему адносінаў бацькоў і дзяцей, паказвае, што гэтыя адносіны вымагаюць зацікаўленага стаўлення старэйшых, неабыякавасці, увагі, адпаведных высілкаў і клопатаў пра душэўнае здароўе дзіцяці. Хто, як не бацька і маці, нясуць адказнасць за ўчынкі, выхаванне і лёс Сержа. Уласна кажучы, якімі будуць дзеці, многае, калі не галоўнае, залежыць ад сям'і. Аўтар пакідае надзею, што Серж, зразумеўшы свае памылкі, памяняецца, стане іншым і лепшым.

Кузьма Чорны ў аповесці «Насцечка» выступае як сапраўдны педагог-псіхолаг. Ён хваляваўся пра маральны стан дзяцей і падлеткаў, акцэнтаваў увагу на тым, што іх узаемаадносіны павінны быць пазбаўлены варажнечы і жорсткасці. Канфлікты і сутычкі паміж раўналеткамі — гэта падстава задумацца пра тое, да чаго можа прывесці, з аднаго боку, агрэсія і гнеў, а, з другога, бескантрольнасць крытычнай сітуацыі ці моцнае пачуццё крыўды. На шляху агрэсіўнага Сержа паўстаў дзед Насцечкі, які абараніў унучку ад адмысловага палявання і расправы малога хулігана. У атмасферы нянавісці і помсты недалёка і да трагічнага фіналу. Таму Кузьма Чорны папярэджваў пра наступствы дзіцячай жорсткасці, цяжкія вынікі, прычынай якіх з'яўляюцца пагардлівыя і зневажальныя адносіны да сваіх аднагодкаў. Пісьменнік меў рацыю, што трэба з ранніх гадоў клапаціцца пра гуманнае развіццё асобы, прышчапляць дзіцяці этычныя правілы паводзінаў, абуджаючы добрыя манеры і пачуцці. Для таго каб сын ці дачка сталі сапраўднымі, глыбока чалавечнымі людзьмі, для гэтага патрэбна вялікая праца, якая немагчыма без ахвяравання сваім часам. Сержу акурат не хапала бацькоўскай увагі і бацькоўскіх урокаў жыцця. Крайняму эгаізму, канфліктным паводзінам і стасункам пісьменнік супрацьпастаўляў сяброўства і дружбу. У «Насцечцы» ён пакінуў свой духоўна-маральны запавет нашчадкам, новым пакаленням дзяцей: «Дружба — вялікая справа. Без дружбы чалавеку цяжка жыць… Дружба робіць вялікія справы. І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць. Шануйце, дзеці, дружбу, гэтае самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека. Растайце вялікія і аберагайце праз усё жыццё дружбу. І ведайце — асабліва моцная павінна быць тая дружба, што ўстанаўліваецца ў маленстве і маладыя гады». Сапраўды, сяброўства — вялікая стваральная сіла, без яе слабее чалавечая супольнасць. Кузьма Чорны раіў і падказваў: з сяброўска-паважлівых адносінаў адзін да аднаго трэба пачынаць выбудоўваць сваё жыццё. Чалавек сярод іншых людзей з дзяцінства павінен імкнуцца наладжваць прыязныя, добразычлівыя і гарманічныя стасункі.

**Спіс літаратуры**

1. *Александровіч, С.* Слова — багацце : літ.-крытыч. арт. / С. Александровіч. — Мінск : Маст. літ., 1981. — 414 с.
2. *Чорны, К.* Выбраныя творы / К. Чорны ; уклад. і прадм. М. Тычыны ; камент. М. Тычыны, Я. Янушкевіча. — Мінск : Беллітфонд, 2000. — 608 с.
3. *Чорны, К.* Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны. — Мінск : Маст. літ., 1972—1975. — 8 т. Далей тэксты твораў пісьменніка, апрача асобна адзначаных выпадкаў, цытуюцца па гэтым выданні.

*Заканчэнне будзе.*